# Набываць веды намаганнямі думкі

***І. С. Шаламіцкая,***

***настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі***

***СШ № 9 г. Пінска***

Жыццё ставіць перад чалавекам вострыя і неадкладныя задачы і праблемы. Узнікненне такіх праблем, цяжкасцей,нечаканасцей азначае, што ў тым, што нас акружае, шмат невядомага, нязведанага. Значыць, трэба больш глыбокае пазнанне свету. Як бы ні мяняліся школьныя праграмы і падручнікі, фарміраванне культуры інтэлектуальнай дзейнасці вучняў заўсёды было і будзе адной з агульнаадукацыйных і выхаваўчых задач. Інтэлектуальнае развіццё – важнейшы бок падрыхтоўкі падрастаючага пакалення. Поспех інтэлектуальнага развіцця вучня дасягаецца ў асноўным на вучэбным занятку. Немалаважная роля ў гэтым адводзіцца тэхналогіі праблемнага навучання. Што ж такое праблемнае навучанне?

Праблемнае навучанне – навучанне, пры якім вучням веды не даюцца ў гатовым выглядзе, а набываюцца толькі ў працэсе вырашэння праблемнай сітуацыі. Перад настаўнікам стаіць задача сфарміраваць пошукавы стыль мыслення вучняў, прывіць цікавасць да самастойнага рашэння праблемы, што ў сучасных жыццёвых умовах становіцца неабходным уменнем.

Праблемная сітуацыя – пачатковы момант у працэсе мыслення, створаная перашкода, шлях пераадолення якой неабходна знайсці самастойна. Праблемнае заданне (пошукавая задача) – заданне, спосаб выканання і вынік якога вучням загадзя невядомы, але ўзровень іх падрыхтоўкі дазваляе самастойна знайсці спосаб яго выканання і атрымаць адказ. Праблемныя метады – метады, заснаваныя на стварэнні праблемных сітуацый, актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў у пошуку і рашэнні цяжкіх пытанняў, якія патрабуюць актуалізацыі ведаў, умення бачыць за асобнымі фактамі іх сутнасць. Сярод метадаў вылучаюць наступныя:

✓ праблемнае выкладанне матэрыялу;

✓ пошукавая гутарка;

✓ самастойная пошукавая і даследчая дзейнасць вучняў.

На праблемным уроку ідзе творчае засваенне ведаў. А задача настаўніка – накіраваць вывучэнне матэрыялу ў патрэбны бок. Праблемнае навучанне – гэта пастаноўка праблемы і пошук яе рашэння.  Пастаноўка праблемы – гэта этап фармуліравання тэмы ўрока або пытання для даследавання. Пошук рашэння – гэта этап фарміравання новых ведаў.

Станоўчыя бакі выкарыстання дадзенай тэхналогіі:

✓ новую інфармацыю вучні атрымліваюць у ходзе рашэння тэарэтычных і практычных праблем;

✓ у ходзе рашэння праблемы вучні самастойна пераадольваюць цяжкасці;

✓ тэмп перадачы інфармацыі залежыць ад саміх вучняў;

✓ павышаецца актыўнасць вучняў, якая садзейнічае развіццю станоўчых матываў навучання і змяншае неабходнасць фармальнай праверкі вынікаў;

✓ вынікі навучання адносна высокія і ўстойлівыя. Вучні лягчэй прымяняюць атрыманыя веды ў новых сітуацыях і адначасова развіваюць свае ўменні і творчыя здольнасці.

Эфектыўнасць праблемнага навучання заключаецца ў тым, што яно садзейнічае развіццю пазнаваўчай, камунікатыўнай, практычнай, творчай дзейнасці вучняў, гатоўнасці вучняў выкарыстоўваць засвоеныя веды, уменні ў рэальным жыцці для рашэння практычных задач. На ўроках, пабудаваных з выкарыстанннем дадзенай тэхналогіі, поспеху дабіваюцца нават і слабыя вучні, бо яны зараджаюцца ўсеагульным жаданнем знайсці ісціну і непрыкметна для сябе ўключаюцца ў калектыўны дыялог. У канцы такога ўрока вучні без цяжкасцей змогуць выдзеліць этапы ўрока, самастойна зрабіць вывад па ўроку.

Найбольш складаным этапам урока з’яўляецца пастаноўка навучальнай праблемы, а ў выніку – стварэнне праблемнай сітуацыі. Каб дабіцца актыўнасці на ўроку, неабходна выклікаць у вучняў неабходнасць  ў ведах. А

яна ўзнікае ў тых момантах, калі на шляху вучня з’яўляецца перашкода, пераадолець якую ён не зможа без неабходных для гэтага ведаў.

У педагогіцы месца праблемнай сітуацыі адводзіцца часцей за ўсё на этапе знаёмства і вывучэння новай тэмы. Але будзе карысным выкарыстанне праблемнай сітуацыі і на этапах замацавання, сістэматызацыі і абагульнення ведаў.

Рэалізуючы праблемнае навучанне на ўроках беларускай мовы, настаўнік выкарыстоўвае розныя метадычныя прыёмы для стварэння праблемнай сітуацыі. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Працяжнік у бяззлучнікавым складаным сказе”, можна выкарыстаць на этапе тлумачэння новай тэмы праблемную сітуацыю з “цяжкасцю”, у аснове якой ляжыць супярэчнасць паміж неабходнасцю выканаць заданне і немагчымасцю гэта зрабіць без новых ведаў. Напрыклад, на дошцы запісаны сказы, у якіх трэба паставіць знакі прыпынку. Узнікае праблема, як правільна паставіць знак прыпынку ў складаным сказе, калі адзін сказ адрозніваецца сэнсавымі адносінамі паміж часткамі. Разам з вучнямі выпрацоўваецца алгарытм вырашэння існуючай праблемы, пасля чаго вучні самастойна здзяйсняюць пошук правільнага рашэння і ацэньваюць свой выбар.

Другі шлях пастаноўкі праблемнага пытання – дыялог, які падводзіць паслядоўна да новай тэмы. Успомніўшы веды па дадзенай тэме, выканаўшы звыклыя заданні, прааналізаваўшы і параўнаўшы матэрыял, вучні прыйдуць да фармуліроўкі тэмы ўрока.

Дзейсным прыёмам з’яўляецца і лінгвістычны эксперымент, пры якім адны марфалагтчныя формы  або сінтаксічныя канструкцыі замяняюцца другімі. Сюды ж можна аднесці і запаўненне “сляпых” схем, табліц, вызначэнне ключавых слоў. Добрым дзейсным сродкам і стымулам для вучняў з’яўляецца выкарыстанне на ўроках карты-плана ўрока, якая дапамагае кантраляваць час і адсочваць вынікі кожнага вучня.

| Час | Этап урока | Самаацэнка |
|---|---|---|
| | | |

У канцы ўрока кожны вучань бачыць асабістую праблему, над якой трэба папрацаваць дадаткова.

Яшчэ адзін шлях пастаноўкі навучальнай праблемы – паведамленне тэмы настаўнікам у гатовым выглядзе, але з матывацыйнай “плямай”. Матывацыйным штуршком можа быць інтрыгуючае паведамленне (казка, верш, урывак мастацкага твора, вызначэнне значнасці дадзенай тэмы для саміх вучняў.

На этапах замацавання, сістэматызацыі і абагульнення ведаў дзейснымі будуць наступныя формы: стварэнне алгарытмаў правіла, кластараў, выкананне лабараторных работ, лічбавых дыктантаў. На этапе актуалізацыі ведаў апраўданым будзе выкарыстанне “мазгавога штурму”, супастаўлення фактаў, параўнання.

**Урок беларускай мовы ў IX класе**

**Тэма**. Працяжнік ў бяззлучнікавых складаных сказах.

**Мэта:**

✓ стварыць умовы для знаёмства з правіламі пастаноўкі працяжніка ў БСС; выпрацоўкі ўменняў вылучаць, правільна пунктуацыйна афармляць, інтанаваць дадзеныя сказы; вызначаць сэнсавыя адносіны паміж часткамі БСС;

✓ спрыяць развіццю здольнасці вучняў да самаацэнкі;

✓ садзейнічаць развіццю ўменняў працаваць у пары; садзейнічаць выхаванню любові і павагі да роднай мовы праз вусную народную творчасць (прыказкі).

**Задачы** ўрока на мове вучняў:

Пасля сённяшніх заняткаў будзеце **ведаць** умовы пастаноўкі працяжніка паміж часткамі БСС; **умець** вызначаць сэнсавыя адносіны паміж часткамі БСС; інтанаваць БСС, паміж часткамі якіх ставіцца працяжнік; замяняць БСС сінанімічнымі складаназлучанымі і складаназалежнымі сказамі.

**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу

**Абсталяванне:** карткі-памяткі, карткі з заданнямі, карта-план урока, тэставыя заданні, падручнік

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант.**

Урок наш будзе праходзіць пад дэвізам: веды толькі тады веды, калі набыты намаганнямі думак,а не памяццю. Належаць гэтыя словы рускаму класіку Л. М. Талстому. Сапраўднасць гэтых слоў мы і праверым. А каб вы маглі кантраляваць час і адсочваць свае вынікі на кожным этапе ўрока, кожны з вас атрымае карту ўрока,дзе будзеце адзначаць, як прайшоў той ці іншы этап урока.

**II. Праверка дамашняга задання**

1. Работа на картках (індывідуальна) – 4 вучні

2. Работа каля дошкі – 1 вучань. Заданне: запісаць схемы сказаў з дамашняга задання.

*3.* Праверка пр. 135 (6–10 сказы). Вучні па чарзе чытаюць сказы, вызначаюць сэнсавыя адносіны паміж часткамі, тлумачаць знакі прыпынку.

**III. Актуалізацыя ведаў**

**1. Работа са сказамі на картках** (калектыўна)

КАРТКА №1. Заданне: прачытаць сказ з патрэбнай інтанацыяй, паставіць неабходны знак прыпынку, патлумачыць.

Шануй бацьку з маткай ( ) другіх не знойдзеш.

Праўду кажуць ( ) адна бяда не ходзіць.

Усё было ў гэтых песнях ( ) прастор палёў, шум крыніцы пад гарою, мілы шэлест каласоў.

Прыгледзьцеся ( ) новыя дні на вас пазіраюць у іскрах світання.

Ідзе па вуліцы ( ) лебедзь плыве.

**IV. Увядзенне ў тэму ўрока**

✓ Які сказ лішні? Чаму? Чым ён адрозніваецца?

✓ Які знак прыпынку патрэбен у гэтым сказе?

✓ Ад чаго ён залежыць?

✓ Што нам дапаможа вызначыць сэнсавыя адносіны паміж часткамі дадзенага сказа?

✓ Перабудуйце сказ. Што атрымалася? Зрабіце выснову.

✓ Назавіце тэму сённяшняга ўрока. Запішыце ў сшыткі.

**V. Паведамленне тэмы і задач урока**

✓ Спрагназуйце **задачы**, якія нам трэба вырашыць на ўроку.

✓ Давайце яшчэ раз скажам, пры якой умове паміж часткамі БСС ставіцца працяжнік.

✓ Прачытайце сказы на дошцы. Што гэта за сказы? Патлумачце значэнне прыказак.

- Быць добрым зусім не цяжка – цяжка быць справядлівым.
- Хочаш дабіцца павагі – пачынай з сябе.
- Бярыся дружна – не будзе натужна.

✓ Вызначце ўмовы пастаноўкі працяжніка ў дадзеных сказах. Зрабіце выснову і агучце.

✓ Цяпер звярніцеся да **карткі-падказкі** і параўнайце свае вывады з правілам.

**Знакі прыпынку ў бяззлучнікавым складаным сказе**

**Працяжнік**

| Адносіны паміж часткамі | Можна ўставіць | Прыклады |
|---|---|---|
| [час /умова ] – [ ] | калі (перад першай часткай | Адчыніш фортку – павее халадок. |
| [ ] – [вынік /вывад ] | таму, і таму | Гаспадарка яе невялікая – Даша адна спраўлялася з ёю. |
| [ ] – [параўнанне ] | як, быццам | Слова сказаў – сякераю адсёк.<br>Ідзе па вуліцы – лебедзь плыве. |
| [ ] – [ ] | але, а, аднак | Мы паспрабавалі абняць дуб-велікан |

| | | |
|---|---|---|
| Супрацьпастаўленне | | учатырох – не хапіла сіл. |
| [ ] – [ ]<br>Хуткая змена падзей, нечаканы вынік | і, аж | Зачэпіш галінку – на галаву снег, як са страхі. |
| [ ] , [ ] – [вынікова-абагульняльнае значэнне ] | - | Ніжэй стала хадзіць сонца, пажаўцела трава на паплавах, збіраюцца стайкамі вераб'і – усё гэта гаворыць аб наступленні восені. |

✓ Ці ўсе выпадкі былі названы?

✓ Які спосаб праверкі прапануецца для вызначэння сэнсавых адносін паміж часткамі БСС?

✓ Вызначце ключавыя словы тэмы (БСС, працяжнік, сэнсавыя адносіны, час, умова, парашнанне, супрацьпастаўленнне, вынік, хуткая змена падзей, абагульненне).

✓ Зрабіце кароткае **паведамленне** пра пастаноўку працяжніка ў БСС.

✓ Адзначце ў карце ўрока выкананне задання.

**VI. Моўная размінка**

Што іграе важную ролю пры выбары знака прыпынку паміж часткамі БСС?

Заданне: прачытаць сказ з патрэбнай інтанацыяй. Дапамагаць вам будуць карткі-памяткі (с. 148, пр. 139. (3-4 сказы)).

<u>Памятка па інтанаванні складаных бяззлучнікавых сказаў</u>

[ ] , [ ] – сэнсава-граматычныя часткі сказа чытай з інтанацыяй пералічэння.

[ ] : [ ] – лагічны націск пастаў на слове з другой часткі. Паніжай голас у канцы першай часткі сказа.

[ ] [ ] – першую частку сказа чытай з павышэннем голасу, потым рабі доўгую паўзу, другую частку – з паніжэннем голасу.

✓ Ці ёсць розніца ў інтанаванні сказаў з двукроп'ем і працяжнікам?

**Прамежкавая рэфлексія:** Якія веды і ўменні вы прымянілі на дадзеным этапе? Адзначце вынікі ў карце.

**VI. ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА**

**VI. Замацаванне**

**1. Лічбавы дыктант**

Заданне: на слых вызначыць сэнсавыя адносіны паміж часткамі БСС і запісаць нумар сказа ў табліцу (ляжыць у кожнага на парце).

1) Сумленне згубіш – другога не купіш.

2) Добрае слова сваё месца знойдзе – дрэннае слова гаспадара пакарае.

3) Бліснула маланка – стала відна як удзень.

4) Рушыўся снег, зашумела вада, раскаваліся рэкі ад льду – прыйшла вясна.

5) Апаласні твар халоднай вадой – соняк рукой здыме.

6) Слова сказаў – сякераю адсёк.

Абмяняйцеся карткамі і праверце работу аднакласніка. Затым праверка з правільнымі адказамі.

✓ Што трэба ўмець, каб выканаць такое заданне?Адзначце свае дасягненні ў карце.

2. **Работа ў парах.**

Заданне: кантралюючы работу адзін аднаго і дапамагаючы, сумесна выканайце заданне. Запішыце ў сшытак сказы, пастаўце патрэбны знак прыпынку, патлумачце графічна. (ВЫБАРАЧНАЯ ПРАВЕРКА!)

1) Гэта не я гавару () гора маё гаворыць. 2) Маці аладкі пячэ, бабка карову доіць, тата хамут ладзіць () поўная дынаміка жыцця.

**Прамежкавая рэфлексія.** Чым карысны быў гэты этап урока? Адзначце ў карце.

**3. Самастойная работа**

Заданне: у вас на партах знаходзяцца карткі з рознаўзроўневымі заданнямі. Выберыце, калі ласка, заданне па сваіх магчымасцях і выканайце яго.

Прыклад. Выпішыце БСС, падкэсліце граматычную аснову.

1) Пагаворыш з добрым чалавекам – сонечны прамень асвеціць тваю душу. 2) Жадаеш сабе дабра – не рабі зла другому. 3) Мудрасць дабрыні ў адным: яна не да сябе, а да людзей, да ўсяго навакольнага. 4) У кожнай пары свая жорсткасць, а дабрыня адна на ўсе часы.

Якія пытанні ўзніклі ў ходзе работы? Адзначце сваю работу ў карце урока.

**VII. Падвядзенне выніккаў урока**

Прааналізуйце карту ўрока і вызначце для сябе, што неабходна паўтарыць да наступнага ўрока.

**VIII. Дамашняе заданне**

1. Правіла на с. 148, пр. 144.

2. Выпісаць з тэкстаў мастацкіх твораў 6 БС сказаў з рознымі знакамі прыпынку паміж часткамі, скаласці схемы.

**VI. Рэфлексія**

Выкажыце, калі ласка, з якімі думкамі вы пакідаеце клас:

1. Веды толькі тады веды, калі набыты намаганнямі думак,а не памяццю.

2. Ах, як я стаміўся ад гэтай мітусні!

3. Да экзамена рыхтавацца не так-та проста!

Пры выкладанні **літаратуры** настаўнікі часта выбіраюць такую форму ўрока, як дыспут, дыскусія. Урок-дыспут з’яўляецца адной з форм актывізацыі вучняў, сродкам павышэння цікавасці да чытання, да прадмета ў цэлым. Дыспут развівае вусную мову, стымулюе творчую самастойнасць вучняў. Так, пры вывучэнні аповесці “У палескай глушы” з трылогіі Я. Коласа “На ростанях”, вучням прапаноўваецца адказаць на пытанні: у чым заключаецца сэнс жыцця для кожнага з герояў аповесці? Хто з герояў змог бы лёгка прыстасавацца ў сучасным жыцці? А каму было б цяжка? Чаму? Ці зменяцца погляды Лабановіча, калі ён трапіць у сучаснае грамадства?

Знаходзячы адказы на гэтыя пытанні, вучні вучацца аналізаваць учынкі героя, думкі, справы, яны як бы прымяраюць героя на сябе.

Вывучаючы апавяданне І. Навуменкі “Сямнаццатай вясной”, на ўроку карысным будзе **прыём перакрыжаванай дыскусіі**. Перад вучнямі паўстае пытанне: ці можна паводзіны герояў твора назваць ідэальнымі, правільнымі? Вучні працуюць у групах, прыводзяць аргументы “ЗА” і “СУПРАЦЬ”. Яшчэ адным праблемным пытаннем да гэтага твора будзе наступнае: як вы думаеце, калі заўтра пачнецца вайна, ці здолее наша маладое пакаленне падняцца на барацьбу? Ці ёсць у наш час прыклады гераізму салдат, якія служаць сёння ў арміі? Гэтыя пытанні прымушаюць задумацца і аб патрыятызме ў нашы дні, і аб нежаданні маладых людзей служыць у арміі.

Выкарыстоўваючы праблемныя пытанні, мы ставім вучняў перад маральным выбарам, вучым фарміраваць асабістае меркаванне і ўменне яго абараніць. Самае важнае – любое пытанне павінна быць звязана з жыццём.

Праблемная сітуацыя можа скласціся і на пачатку ўрока, калі дзецям прапануецца шэраг выказванняў, аб’дnaных адной тэмай, і трэба самастойна вызначыць тэму вучэбнага занятка.

Існуе шмат розных формаў работы на праблемным уроку. Так, пры вывучэнні верша М. Танка “Шчасце” вучням загадзя прапанавалася правесці інтэрв’ю “Як вы разумееце слова шчасце? Што значыць для вас быць шчаслівым?” з бацькамі, настаўнікамі, аднакласнікамі і вынікі працы аформіць у выглядзе табліцы. Непасрэдна на ўроку, аналізуючы праведеную работу, вучні складалі праект шчасця ў выглядзе кластара. Цікава гэтая форма ўрока праходзіць пры вывучэнні біяграфіі пісьменніка, калі вучні самі выступаюць у ролі журналістаў і самога пісьменніка або аднаго з герояў літаратурнага твора. Групавыя формы работы прадстаўляюць вучням вялікія магчымасці для камунікацыі, надаць пачуццё ўпэўненасці пры адказе.

Праблемнасць у навучанні можна стварыць і тады, калі матэрыял падаецца настаўнікам, а вучань дзеліць дадзены матэрыял на часткі, складае

тэзісны план, вылучае ключавыя словы, а потым на іх аснове стварае сваё паведамленне.

На этапе замацавання матэрыялу добрым метадычным падыходам будзе стварэнне праблемнай сітуацыі праз праблемную задачу: скласці сцэнарый эпізода, паставіць сябе на месца героя і падрыхтаваць зварот ад яго імя, скласці прэзентацыю і іншыя.

ЛІТАРАТУРА

1. Матюшкин, А.М. Проблемные ситуации в мышлении и обучении.

2. Махмутов, М.И. Проблемное обучение: основные вопросы теории. – М.: Педагогика, 1975.

3. Оконь, В. Основы проблемного обучения. – М., 1968.

4. Селевко, Г.К. Педагогические технологии на основе активизации и интенсификации деятельности учащихся. М.: Центр «Педагогический поиск» 2000. – 168 с.

5. Бабанский, Ю. К. Выбор методов обучения в средней школе. – М.: Педагогика, 1981.